БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

# ГАДАВАЯ СПРАВАЗДАЧА ПРА НЯЎДАЧЫ

*і дасягненні*

FAILED

БЕЛАРУСКІ
ХЕЛЬСІНКСКІ
КАМІТЭТ

# НАВОШТА
## МЫ НАПІСАЛІ ГЭТЫ ТЭКСТ

Традыцыйна ў канцы году людзі падсумоўваюць вынікі. Напрыканцы 2023 г. і мы хочам падзяліцца тым, што ў нас не атрымалася або спрацавала ня так, як хацелася. Для нас гэта спроба асэнсаваць недахопы і запрасіць да такога асэнсавання калег і партнёраў, каб на наступны год палепшыцца. Давайце абмяркоўваць і шукаць шляхі вырашэння разам!

Натуральна, мы распавядзем і пра тое, што ў нас выйшла добра:)

*У гэтым тэксце:*

- Індэкс правоў чалавека: мы не былі гатовыя да такой глыбокай ямы – ні сэнсава, ні аперацыйна. Давялося перабудоўвацца па дарозе.
- Агляд трэндаў у вобласці палітыкі Беларусі ў сферы правоў чалавека: мы стварылі добры прадукт, але пакуль не змаглі прасунуць яго на ўнутраным рынку. На знешнім контуры спрацавалі някепска.
- Міжнародныя праваабарончыя механізмы: неправаабарончыя ініцыятывы не асабліва імкнуцца іх выкарыстоўваць.
- Стажыроўка для стурэнтак_ў юрыдычных спецыяльнасцяў: вялікі попыт, але гэта вымагае ад нас большага ўкладу ў людзей, чым мы думалі.



З розных прычын мы не змаглі сфатаграфавацца ўсёй камандай, каб ілюстраваць гэтую справаздачу. Таму мы згенеравалі карцінку, якой хочам выказаць свае пачуцці да чытачоў, у AI.

*Калі ласка, пакіньце нашай камандзе свае водгукі, ідэі, пажаданні тут.*

***Можна ананімна.***

# Індэкс правоў чалавека




У 2023 годзе мы працягнулі стварэнне <u>Нацыянальнага індэксу правоў чалавека</u>. Гэта індэкс стварае група экспертак_ў грамадзянскай супольнасці пры агульнай каардынацыі Беларускага Хельсінкскага Камітэту.

Мы робім гэты індэкс дзеля трох рэчаў:

- каб зацікаўленыя прафесіяналы маглі хутка ацаніць агульную сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі, а не збіраць інфармацыю з разрозненых крыніц;
- каб паказаць, як змяняецца сітуацыя;
- по сутнасці індэкс паказвае кірунак рэформаў у сферы правоў чалавека, у якіх мае патрэбу наша краіна.

# ІНДЭКС ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

## МЫ БЫЛІ НЕ ГАТОВЫЯ ДА ЯМЫ ТАКОЙ ГЛЫБІНІ – НІ СЭНСАВА, НІ АПЕРАЦЫЙНА

### З чым у нас узніклі праблемы

Мы моцна засяродзіліся на сэнсавай частцы індэкса і не былі гатовыя да упраўленчых выклікаў. Што будзе, калі шчыльнасць падзей у сферы правоў чалавека ўзрасце ў разы і ва ўсіх сферах — як мы будзем збіраць і апрацоўваць інфармацыю? Што будзе, калі частка экспертаў апынецца ў зняволенні / пачне адмаўляцца з-за страху пераследу і нам давядзецца шукаць новых? Нам давялося перабудоўваць аперацыйныя працэсы, і Індэкс выйшаў са спазненнем.

У момант распрацоўкі метадалогіі індэкса ў 2018 годзе ніхто не думаў, што яма можа аказацца такой глыбокай... Мы пачынаем сутыкацца з абмежаваннямі метадалогіі: паводле некаторых кампанентаў за 2022 г. нашыя эксперты паставілі самую нізкую магчымую адзнаку (адзнакі за 2023 г. з'явяцца ўжо ў новым годзе). Пры гэтым мы разумеем, што сітуацыі яшчэ ёсць куды пагаршацца. Сёлета мы ўнеслі ўдакладненне ў метадалогію, у прыватнасці, увялі дзясятыя балаў у шкалу адзнакі, а таксама абмеркавалі сцэнарыі, што рабіць, калі адзнака дасягае найніжэйшай рысы.

У 2018 годзе, калі ажыццяўляўся выбар правоў для Індэкса, ніхто не мог уявіць, што, напрыклад, свабода перасоўвання, якую мы вырашылі не браць у Індэкс, таму што "з ёй жа ўсё нармальна", раптам стане груба парушацца і стане такой актуальнай. Пакуль мы не вырашылі, што з гэтым рабіць.

## Што было добрага

Напачатку 2024 года выйдзе справаздача за 2023 год. Гэта будзе азначаць, што мы сабралі, ацанілі і перавялі ў лічбы тое, што адбываецца з правамі чалавека ў краіне за 5 год.

Гэта вельмі вялікі аб'ем дадзеных: за кожны год робяцца ацэнкі па канкрэтных правах (18) / агульных мерах (4), іх кампанентах (64) і індыкатарах (321).

Мы пераклалі індэкс на англійскую мову і актыўна прасоўваем яго міжнародным партнёрам, каб утрымліваць фокус іх увагі на Беларусі.

Мы захавалі і нават трохі павялічылі шэрагі экспертаў, якія робяць індэкс разам з намі. Цяпер з намі працуюць 42 эксперты з розных сфераў! Беларуская экспертная супольнасць (як і ўся грамадзянская супольнасць) праходзіць праз складаныя часы, і мы радыя, што нам па-ранейшаму давяраюць і гатовыя з намі працаваць.

# ІНДЭКС ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

## ХУТКА АПУБЛІКУЕМ ДАДЗЕНЫЯ ЗА 5 ГАДОЎ

Дарэчы, уявіце, што калі мы пачыналі распрацоўваць гэты Індэкс у 2018 годзе, над ім працавалі 6 чалавек, а зараз у яго так ці інакш уцягнуты больш за 50 спецыялістаў!

Тады, у 2018 годзе мы шукалі лепшую структуру для Індэкса. Каб не перамалёўваць схемы на чарнавіках кожны раз нанова, мы проста наляпілі стыкеры, якія сімвалізуюць розныя структурныя часткі, на спецыяльна выдзелены стол. Калі камусьці прыходзіла ў галаву новая ідэя, ён проста пераклейваў стыкер.

# Агляд трэндаў дзяржпалітыкі ў галіне правоў чалавека

У 2023 годзе мы запусцілі агляд трэндаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне правоў чалавека.

У “трэндах” мы асвятляем найбольш значныя змены па трох кірунках:

- **агульныя меры**: сістэмныя рэчы — заканадаўства, стратэгіі, палітыкі, якія ў цэлым вызначаюць умовы і перадумовы рэалізацыі правоў чалавека ў краіне;
- **правапрымяняльная практыка**: канкрэтныя парушэнні грамадзянскіх і палітычных, сацыяльных, эканамічных і культурных правоў;
- ключавыя **рашэнні і рэакцыі міжнародных структур**, звязаныя з сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі.

*Наступны паўгадавы агляд выйдзе ў пачатку 2024 г. Падпісацца на "трэнды" можна тут.*

# АГЛЯД ТРЭНДАЎ ДЗЯРЖПАЛІТЫКІ Ў ГАЛІНЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

## ПАКУЛЬ НЕ ЗДОЛЕЛІ ПРАСУНУЦЬ ПРАДУКТ НА ЎНУТРАННЫМ РЫНКУ

### Чаго пакуль не ўдалося зрабіць

Мы спадзяваліся, што экспертная супольнасць у сваёй працы будзе актыўней карыстацца “трэндамі”. Пакуль жа мы атрымліваем пазытыўную зваротную сувязь ад гэтай аўдыторыі, але здаецца, нібыта на самой справе неправабарончыя эксперты з сумежных сфераў не вельмі актыўна выкарыстоўваюць нашыя напрацоўкі на практыцы.

Мы не знайшлі ўдалага фармату прасоўвання нашага агляду для экспертаў і журналістаў. У студзені 2024 года выйдуць свежыя “трэнды” і мы яшчэ думаем, як абмяркоўваць іх з аўдыторыяй.

Нам бракуе актыўных амбасадараў тэмы правоў чалавека ад неправаабарончай экспертнай супольнасці.

# АГЛЯД ТРЭНДАЎ ДЗЯРЖПАЛІТЫКІ Ў ГАЛІНЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

## СПРАЦАВАЎ НА ЗНЕШНІМ КОНТУРЫ




Каб прыцягнуць увагу міжнароднай аўдыторыі, замест звычайнага праваабаронча-васільковага мы нават выбралі колер viva magenta.

Па версіі інстытута колеру Pantone гэта колер 2023 года. Прадстаунікі Інстытута апісваюць гэты колер як смелы, дасціпны і усёабдымны; колер, які вітае кожнага з імкненнем да жыцця.

БХК выкарыстоувае гэты колер, каб паспрабаваць вярнуць увагу свету да Беларусі, нагадаць, што мы — частка глабальнага працэсу, і бяспека нашай краіны уплывае на бяспеку усяго рэгіёна.

### Што добрага

Мы бачым, што агляд трэндаў працуе для дыпламатаў і міжнародных арганізацый, дапамагае глыбей разумець тое, што адбываецца ў Беларусі, у тым ліку на стратэгічным узроўні.

Атрымаўся дастаткова ўнікальны прадукт, які разам з Індэксам дазваляе зрабіць zoom out, каб ацаніць цяперашнюю сітуацыю і выдзяліць асноўнае. Гэта здаецца нам асабліва важным у сітуацыі, калі аўдыторыю проста зносіць плынню падзей.

У цэлым мы задаволеныя, што запусцілі “трэнды”. Ідэя належала Алегу Гулаку і яна не была глыбока прапрацаваная на момант ягонага сыходу з жыцця.

# Міжнародныя праваабарончыя механізмы

За гэты год мы падрыхтавалі 9 дакладаў і 6 паведамленняў у Спецыяльныя працэдуры ААН. Мы працягнулі ўзаемадзеянне і з АБСЕ: сумесна з кааліцыяй беларускіх праваабарончых арганізацый падрыхтавалі даклад у рамках зноў запушчанага Маскоўскага механізма АБСЕ, а таксама накіравалі інфармацыю аб злачынствах на глебе нянавісці, здзейненых у 2022 годзе.

Да канца 2023 году пад агульнай каардынацыяй БХК кааліцыя праваабарончых арганізацый падрыхтавала вялікую прамежкавую справаздачу аб выкананні Беларуссю рэкамендацый трэцяга цыклу УПА.

Таксама мы прасоўваем важнасць працы з міжнароднымі механізмамі сярод беларускіх АГС і ініцыятываў. Мы кансультуем іх і забяспечваем працу спецыяльных інструментаў для юрыстаў і менеджараў грамадскіх арганізацый: даведкавай сістэмы па правах чалавека і календара міжнародных механізмаў.

## Што не спрацавала

Беларускія ініцыятывы недастаткова актыўна кіруюць паведамленні ў рамках міжнародных механізмаў, хаця валодаюць унікальнай экспертызай і ведамі аб парушэннях правоў іх мэтавых групаў.

Мы разумеем, што тут працуе комплекс фактараў (і пытанні завялікай нагрузкі, і пытанне бяспекі, і недавер да міжнародных механізмаў), але нам здаецца карысным, каб такая праца ішла.

# МІЖНАРОДНЫЯ МЕХАНІЗМЫ

## НЕПРАВААБАРОНЧЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ НЕ НАДТА ІМКНУЦЦА ІХ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ

## Што добрага

Нягледзячы на ўсе складанасці, дзякуючы нашым кансультацыям некалькі інцыятываў паздзельнічалі ў прадастаўленні інфармацыі у рамках міжнародных праваабарончых механізмаў (мы не называем ініцыятывы з меркаванняў бяспекі).

.



| | | |
|---|---|---|
| Пространство для тетел | гражданское общество, право на свободу ассоциаций, сбо | December 31, 2023 |
| Доклад Специального до | право на свободу ассоциаций, беларусы в изгнании | February 15, 2024 |
| Выборы и насильственнь | насильственные исчезновения, выборы | February 15, 2024 |
| Центральное значение у | женщины, лица с инвалидностью, социальная защита, сс | April 13, 2024 |
| Альтернативный доклад | запрет расовой дискриминации, дискриминация | July 15, 2024 |
| Доклад для Универсальн | УПО | March 13, 2025 |

*Калі ласка, звярніце ўвагу, што мы вядзем для НДА і юрыстаў каляндар міжнародных механізмаў і адмысловы database па стандартах правоў чалавека.*

# Стажыроўка для студэнтак_у

Два разы на год мы набіраем беларускіх студэнтак_аў юрыдычных спецыяльнасцяў на трохмесячную ан-лайн стажыроўку.

У межах гэтай стажыроўкі стажоры разбіраюць рэальныя кейсы. Таксама часткай стажыроўкі з’яўляюцца майстэрні-дыскусіі па актуальных напрамках тэматыкі правоў чалавека. Некаторыя з тэмаў: філасофія і каштоўнасці правоў чалавека, роўнасць і недыскрымінацыя, бізнес і правы чалавека, legal research.

Гэта няпростая стажыроўка, яна азначае вялікую ўключанасць як ад стажорак_ў (ад 8 да 15 гадзін на тыдзень), так і ад ментарак_ў.

Сёлета мы завяршылі 4 набор.

### Што пайшло не так

Мы спадзяваліся, што будзем даваць стажорк_ам якаснае ментарства, а ўзамен яны забяруць частку нашай нагрузкі у выкананні практычных заданняў. Мы адразу закладвалі пэўныя рызыкі, якія могуць уплываць на эфектыўнасць (фактар анлайна, розны бэкграўнд стажорак_ў у галіне правоў чалавека), але ў рэальнасці на многіх стажорак_ў (але ня ўсіх!) мы ўсё адно трацім нашмат болей рэсурсу, чым запланавалі і чым атрымліваем аддачы на кароткай дыстанцыі.

Цяпер нам трэба пераглядзець схему ўзаемадзеяння са стажорк_амі і сваю працоўную нагрузку з удзелам гэтага дысбалансу, таму што мы сапраўды хочам навучыць стажорак_ў, а не загнаць іх ці сябе ў стрэс.

## СТАЖЫРОЎКА

## ВЯЛІКІ ПОПЫТ, АЛЕ ГЭТА ВЫМАГАЕ АД НАС БОЛЬШАГА ЎКЛАДУ Ў ЛЮДЗЕЙ, ЧЫМ МЫ ДУМАЛІ

### Што добрага

Мы бачым, што на такі фармат ёсць вялікі попыт. Конкурс падчас апошняга адбору склаў 4 чалавекі на месца.

44% заяўніц_каў стала знаходзяцца ў Беларусі. Яны ўдзячныя за магчымасць стажыроўкі, бо, паводле іх словаў, мала хто сёння пагаджаецца працаваць з людзьмі з Беларусі з меркаванняў бяспекі, і яны адчуваюць сябе “выключанымі”.

Мы атрымалі 71% адзнак “цалкам задаволеная_ы стажыроўкай” і 93% адзнак “цалкам задаволеная_ы” + “хутчэй задаволеная_ы”.

# Іншыя актыўнасці

Разам з Саветам Еўропы і беларускімі эксперткамі_амі мы пачалі абнаўляць **Канцэпцыю антыдыскрымінацыйнага заканадаўства** і антыдыскрымінацыйных мераў для Беларусі. Мы плануем завяршыць гэтую працу напачатку 2024 года і атрымаць гатовую рамку для рэформы ў гэтай сферы, у тым ліку і канцэпцыю Закона "Аб рознасці і недыскрымінацыі".

БХК **пяць разоў задзейнічаў свой кансультацыйны статус пры ЭКАСОС**, прадаставіўшы 4 вусныя і 1 пісьмовую пазіцыю падчас 52-й, 53-й і 54-й сэсій Савета па правах чалавека.

Мы зрабілі **даследаванне нефармальнай адукацыі ў галіне правоў чалавека** і разам з Беларускім домам правоў чалавека імя Барыса Звозскава правялі канферэнцыю з удзелам профільных і няпрофільных правайдэраў. Нашай асноўнай мэтай было выявіць праблемы і выклікі ў гэтай сферы і запусціць дыскусію сярод беларускіх АГС, якія займаюцца такой адукацыяй. Таксама на аснове вынікаў гэтага даследавання ў 2024 годзе мы плануем распрацоўваць свае адукацыйныя прадукты.

У 2023 г. эксперткі_ы БХК шмат узаемадзейнічалі з самымі рознымі суб'ектамі, якія бяруць удзел у распрацоўцы канцэпцый і стратэгій рэформ для дэмакратычнай Беларусі. Мы нагадвалі пра каштоўнасці правоў чалавека і дапамагалі зразумець стандарты і міжнародныя абавязальніцтвы краіны ў гэтай тэме. Так, напрыклад, мы здолелі прынесці шэраг карысных праваабарончых ідэй у **Канцэпцыю кампенсацыі шкоды асобам, рэпрэсаваным** падчас рэжыму Лукашэнкі, і недапушчальнасці паўтарэння сур'ёзных парушэнняў правоў чалавека, падрыхтаваную Офісам Святланы Ціханоўскай.

Разам з партнёрамі па Кантактнай групе ў Савеце Еўропы дапамаглі арганізаваць **два трэнінгі для беларускіх юрыстак_ў**.

Нашыя юрысты правялі **каля 300 кансультацый для грамадзянаў**. Эксперты ў галіне human rights based approach правялі амаль 20 кансультацый для неправаабарончых ініцыятываў.

# Пасляслоўе

Уся гэтая праца была б немагчымай не толькі без каманды БХК, але і без нашых сяброў і партнёраў, якія заўжды побач.

Сёння мы хочам сказаць:

**Людзям, якія не карыстаюцца паслугамі БХК наўпрост, але ўсведамляюць важнасць еўрапейскіх каштоўнасцяў,**
Без вас нічога не будзе! Чытайце незалежныя медыя, абмяркоўвайце з блізкімі, працягвайце марыць і планаваць, як яно ўсё будзе. Калі ласка, памятайце пра лічбавую і псіхалагічную бяспеку.

**Калегам з ініцыятываў і арганізацый грамадзянскай супольнасці,**
Вы вялікія малайцы за тое, што змаглі захавацца і працягнуць сваю працу. Калі ласка, не спыняйцеся. Мы заўсёды гатовы дапамагчы з human rights based approach, з міжнароднымі механізмамі і іншай нашай экспертызай :)

**Юрыстам, дзейным адвакатам і адвакатам, часова пазбаўленым права на прафесію,**
Памятайце, што вяршэнства права і правы чалавека — не пусты гук. Развівайцеся, дыскутуйце з калегамі і рыхтуйце сябе для будучых рэформ. Усё часова, настануць часы і круцейшыя.

**Міжнародным механізмам і супольнасці,**
Act for Belarus! It matters for the region!

# Пасляслоўе

Мы хочам сказаць **беларускім уладам**:

Тысячы нявінных людзей знаходзяцца або прайшлі праз зняволенне, сотні тысяч людзей з'ехалі з краіны, баючыся адвольных затрыманняў. Усё гэта — зламаныя лёсы.

Нягледзячы на тое, што гэта ўжо здарылася, **усё яшчэ застаецца магчымасць хоць неяк змякчыць наступствы**.

Мы ў чарговы раз заклікаем беларускія ўлады спыніць рэпрэсіі, вызваліць і рэабілітаваць палітычных вязняў, правесці справядлівыя выбары, пачаць шукаць шляхі вырашэння крызісу.

Калі вы “**звычайны дзяржаўны службовец**”, “**звычайны супрацоўнік праваахоўных органаў**” і ад вас "нічога не залежыць", паспрабуйце мінімізаваць шкоду ад сваіх дзеянняў: запавольвайцеся, сабатуйце злачынныя загады і распараджэнні, памятайце, што побач з вамі невінаватыя людзі і яны проста рэалізуюць свае правы.

БХК побач з вамі з 1 лістапада 1995 г.
www.belhelcom.org